ПУШКІНСКАЯ ВЫСТАЎКА Ў МЕНСКУ

У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна ў Менску адкрылася рэспубліканская пушкінская выстаўка. На ёй выстаўлены рознастайныя экспанаты — старыя выданні, фотарэпрадукцыі, паасобныя дакументы, якія даюць поўнае ўяўленне аб жыцці і творчасці вялікага рускага паэта.

Экспанаты ўзяты з багатага архіўнага фонда бібліятэкі, а таксама з музейных і архіўных фондаў Масквы і Ленінграда.

Багата пададзены кнігі і журналы пушкінскага часу. Тут — «Современник», «Библиотека для чтения», «Московский вестник» і інш. выданні, у тым ліку і замежныя. Вялікі інтарэс выклікае аддзел «Пушкін — вялікі паэт народаў СССР». Тут сабраны творы геніяльнага паэта на дзесятках моваў — украінскай, беларускай, яйрэйскай, польскай, тунгускай, карэльскай, цыганскай і т. д. У паасобнай вітрыне выстаўлены рукапісы перакладаў на беларускую мову «Палтавы» і «Меднага коніка». Як вядома, гэтыя пераклады зроблены народнымі паэтамі БССР Янкай Купалай і Якубам Коласам.

У спецыяльнай скрынцы знаходзіцца картатэка ўсіх выданняў Пушкіна, выпушчаных у дарэволюцыйны перыяд і пасля Кастрычніцкай рэволюцыі. Картатэка налічвае тысячы картак.